Жыві і квітней, Беларусь!

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

4 ЛІПЕНЯ 2020 г. СУБОТА № 128 (29242)




Фота БелТА.

# ПАМЯЦЬ. ГОНАР. БУДУЧЫНЯ

**Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі на цырымоніі ўскладання кветак на плошчы Перамогі з нагоды Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь 3 ліпеня 2020 года**

Паважаныя суайчыннікі, дарагія ветэраны, шаноўныя госці нашай сталіцы!

Дазвольце ад імя беларускага народа павіншаваць усіх вас з Днём Незалежнасці нашай Беларусі!

Тут, на гэтым свяшчэнным месцы, мы аддаём даніну памяці героям, якія змагаліся за нашу зямлю і набліжалі гэты дзень Вялікай Перамогі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны беларускі народ зрабіў гістарычны выбар — паставіў сваю свабоду тады вышэй за сваё жыццё.

Іншага выбару і быць не магло ў нашчадкаў старажытнага славянскага народа — моцнага, гордага і незалежнага. Народа, які ніколі і нікога не прыгнятаў. Народа, які сам ніколі не быў рабом.

Таму непрымірымая барацьба з захопнікамі ішла на нашай зямлі з першага і да апошняга дня акупацыі.

Партызаны, падпольшчыкі, мірныя жыхары, якія дапамалі ім, — мільёны людзей свядома ішлі на смерць, не жадаючы служыць нацыстам.

У радах Мінскага падполля з ворагам змагаліся тысячы савецкіх мінчан.

Сотні герояў падполля ў Мінску закатаваны ў падвалах СД, растраляны і павешаны.

І мы не знойдзем у Еўропе іншы такі горад, у якім ва ўмовах вельмі жорсткага акупацыйнага рэжыму дзейнічаў такі масавы рух супраціўлення.

Цяпер менавіта той час, калі трэба, каб яшчэ гучна і гучней гучалі імёны Івана Кавалёва, Ісая Казінца, Дзмітрыя Караткевіча, Уладзіміра Амельянюка, Івана Кабушкіна і многіх-многіх іншых.

Гэта сапраўдныя патрыёты, рэальныя, непрыдуманыя героі. Нашы суайчыннікі, якія так мала жылі, але так шмат змаглі зрабіць для нашай Айчыны. Разам з імі мы страцілі ў той вайне кожнага трэцяга жыхара краіны.

Не стамляюся гэта паўтараць для тых, хто робіць выгляд, што не ведае, якую вялікую цану заплаціў наш народ за жыццё і свабоду будучых пакаленняў, нас з вамі.

Беларусь памятае і воінаў брацкіх рэспублік, якія прынялі апошні бой на нашай зямлі.

Беларусь памятае ўсіх, хто вызваляў ад фашызму Прыбалтыку і Польшчу, Балгарыю і Румынію, Венгрыю і Аўстрыю, Чэхію і Германію і застаўся там навечна пад абеліскамі.

Мы смуткуем аб ветэранах, якіх ужо няма з намі.

Давайце ж іх светлую памяць, усіх герояў Вялікай Айчыннай вайны ўшануем мінутай маўчання!

*(Мінута маўчання.)*

Асаблівыя словы ўдзячнасці я адрасую ветэранам, якія цяпер разам з намі.

Дзякуй вам за тое, што выстаялі і абаранілі Радзіму!

Вашы бязмежная мужнасць, стойкасць і патрыятызм сталі для нас тым арыенцірам, які дапамагаў і дапамагае нам трымаць любыя ўдары сучаснасці.

Паважаныя сябры!

Мы разам будуем нашу незалежную дзяржаву. Мы ганарымся сваёй гісторыяй і беражом памяць аб гераічным мінулым.

Беларусь — міралюбівая дзяржава і будзе такой заўсёды. Мы выступаем за дыялог краін і народаў, за ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва выключна на раўнапраўнай аснове.

Але сучасны свет становіцца ўсё больш складаным і небяспечным. І сёння многія задаюцца пытаннем: што будзе заўтра? Адказ просты. Наша будучыня залежыць толькі ад нас саміх.

Ніхто не можа звонку пахіснуць тую стабільнасць і незалежнасць, якія сёння ў Беларусі. Толькі мы можам вяршыць лёсы свайго народа на гэтай зямлі. Усё залежыць толькі ад нас. Моц і сілу дзяржавы, непахіснасць яе суверэнітэту вызначае народ сваёй працай, адзінствам і адданасцю роднай зямлі.

Дарагія сябры!

Сёння сімвалічны дзень, ды і ўсё жыццё чалавека, тым больш дзяржавы, створана, як мне здаецца, з сімвалаў. Гэта вялікі сімвалізм, які мы назіраем сёння па ўсёй краіне. Тут, у гэтай тысячнай калоне, разам са старымі, ветэранамі, пакаленнем пасляваенных гадоў наша моладзь. І гэта галоўны сімвал сённяшняга дня. Памятайце, пакуль мы разам са сваімі дзецьмі прыходзім да мемарыялаў і абеліскаў, Гасподзь будзе з намі, ён нас заўсёды зможа абараніць ад бур і нягод. Але як толькі мы забудзем народную сцежку да гэтых велічных месцаў гісторыі нашай краіны, чакайце бяду.

Дзе б вы ні былі: у маленькім гарадку, невялікай вёсачцы, аграгарадку, у абласных цэнтрах або сталіцы нашай Радзімы, — праязджаючы міма, не забывайце спыніцца каля маленькага помніка, каля велічнага абеліска, у вёсцы Боркі і Ала Магілёўскай і Гомельскай абласцей, у легендарнай Брэсцкай крэпасці, тут, у цэнтры нашай сталіцы, не забывайце прыйсці са сваімі дзеткамі і пакласці кветку на гэтыя магілы, палаючую кветку. І за гэта нам будзе адплачана ў нашым жыцці. Не павінна зарасці народная сцежка. Мы сваімі дзеяннямі, сваімі ўчынкамі павінны даказаць, што Беларусь памятае!

Я жадаю нашай роднай Беларусі міру і працвітання.

А беларускаму народу, усім нам — здароўя, шчасця і дабрабыту.

Са святам вас, дарагія сябры!

З Днём Незалежнасці!

ISSN 1990 - 763X

20128>

# ГІСТАРЫЧНЫ ШЛЯХ

## Выступленне Прэзідэнта Беларусі А. Р. Лукашэнкі

Паважаныя суайчыннікі і замежныя госці!

Дарагія ветэраны! Сябры!

Дазвольце мне перш за ўсё павіншаваць вас з Днём Незалежнасці — нашым галоўным дзяржаўным святам, якое стала сімвалам свабоды беларускага народа. Народа, які перамог смерць у самай страшнай вайне ў гісторыі чалавецтва.

Так, да свайё незалежнасці беларусы ішлі больш за тысячу гадоў. Амаль ва ўсе часы, пачынаючы з глыбокай старажытнасці, гэта быў шлях барацьбы. Барацьбы з суровым кліматам за ўраджай, з захопнікамі за зямлю, з прыгнятальнікамі за свабоду, з інтэрвентамі за веру, культуру і традыцыі.

Але Вялікая Айчынная вайна стала вайной за жыццё, за само існаванне нацыі. Вайной за месца беларусаў у гісторыі, за месца маладой савецкай рэспублікі на карце свету. Гады акупацыі наглядна і жорстка паказалі людзям сапраўдны сэнс такіх паняццяў, як бяспека, свабода, суверэнітэт і незалежнасць. Гэтыя каштоўнасці маглі быць страчаны назаўсёды, але былі здабыты ў дзень вызвалення нашай сталіцы — горада Мінска.

З таго часу змянілася амаль чатыры пакаленні беларусаў. Але памяць пра герояў, якія падарылі нам будучыню, жыве ў нашых сэрцах. У ёй шмат болю, але яшчэ больш гонару. У ёй усведамленне, што ўсе мы, сучасныя беларусы, з'яўляемся носьбітамі гена пераможцаў.

Тое, што ў далёкім 45-м беларускі народ адстаяў сваю незалежнасць са зброяй у руках, — гэта сур'ёзны аргумент супраць любога ўмяшання ў жыццё краіны. Але сёння мала падхапіць гістарычны сцяг Перамогі бацькаў і дзядоў, з гонарам пранесці яго і перадаць дзецям.

Настаў час абараніць гонар сцяга пераможцаў. Калі мы бачым, што нават нашчадкі народаў, выратаваных 75 гадоў таму ад фашысцкага рабства і генацыду, разбураюць помнікі савецкім воінам і гераізуюць нацыстаў, мы разумеем, што вайна, на жаль, не закончылася. Яна прадаўжаецца ў культурнай, інфармацыйнай, палітычнай і эканамічнай сферах. У брацкай нам краіне нават перайшла ў гарачую фазу.

А пазней ужо ў былых рэспубліках СССР прывяло да расколу ў грамадстве. Гэты гістарычны вопыт мы ігнараваць не можам, і гэту данасць, якая сёння існуе, мы таксама ігнараваць не можам.

Усведамленне таго, што нашы продкі былі вялікімі людзьмі, — гэта тое, што дае кожнаму новаму пакаленню пачуццё самадастатковасці і гонару за сваё паходжанне, робіць нацыю моцнай і незалежнай. Менавіта гераічныя падзеі мінулага фарміруюць нацыянальную ідэнтычнасць народа і аб'ядноўваюць яго.

Таму любыя спробы дыскрэдытаваць пакаленне пераможцаў мы будзем расцэньваць як замах на суверэнітэт, носьбітам якога з'яўляецца і беларускі народ. І трэба разумець, што нашчадкі і ідэйныя паслядоўнікі тых, хто стаяў па другую лінію фронту, не пакінуць спробы перапісаць гісторыю Другой сусветнай вайны або забыць яе. Але мы не можам, проста не маем права дапусціць гэта. Не маем права ў імя памяці тых, хто аддаў жыццё за свабоду беларускай зямлі, за нашу сённяшнюю сучаснасць і будучыню нашых дзяцей і ўнукаў.

Гістарыяграфія Вялікай Айчыннай вайны — гэта больш за 260 лагераў смерці, больш за 140 карных аперацый на тэрыторыі Беларусі, больш за тры гады нечалавечых пакут беларусаў у акупацыі — у балотах, зямлянках. Гэта памяць увекавечана ў больш як васьмі тысячах мемарыяльных помнікаў, у архіўных кінастужках і дакументах. Яна жыве ў народнай ініцыятыве «Беларусь памятае».

І сёння важна не толькі захаваць, але і давесці да ведама ўсе архіўныя фонды. Гэта пакет контраргументаў, які дапаможа будучым пакаленням беларусаў захаваць гераічную спадчыну сваёй краіны.

Дарагія ветэраны!

Вось ужо 25 гадоў мы разам адзначаем 3 ліпеня Дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дзень Незалежнасці нашай дзяржавы.

Я ўпэўнены, вы шчаслівыя сёння бачыць, што адноўлены вамі мір у краіне мы захоўваем як самую вялікую каштоўнасць у жыцці. І наш святы абавязак — у імя вашага вялікага подзвігу захаваць і перадаць наступным пакаленням мірную, бяспечную і незалежную Беларусь. Нягледзячы на розныя пераплёты сучаснасці, смею вас запэўніць: мы яе захаваем — гэту мірную і незалежную краіну.

Шаноўныя беларусы! Грамадзяне краіны!

Успамінаючы герояў вайны, мы заўсёды кажам пра іх мужнасць, гатоўнасць аддаць жыццё за Радзіму. І разумеем, што выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны абудзілі ў народзе невядомыя раней сілы. Але ж узгадавала іх шматвяковая гісторыя несвабоднага жыцця нашых далёкіх продкаў.

Безумоўна, вытокі нашай незалежнасці бяруць свой пачатак у сівой старажытнасці, у глыбіні стагоддзяў. Яны — у імкненні Полацкага княства да палітычнай і эканамічнай самастойнасці, у стварэнні на нашай зямлі самага прагрэсіўнага права, у шматлікіх навуковых і духоўных працах, у палітычных поспехах суайчыннікаў — яскравых прадстаўнікоў розных гістарычных эпох.

Але так адбылося, што амаль тысячу гадоў выразнікамі нашай волі на беларускай зямлі былі выключна каранаваныя асобы. І толькі ў XX стагоддзі на адвечнае пытанне «А хто там ідзе?» знайшоўся лёсавызначальны адказ. У вельмі складаных умовах трох рэвалюцый, Першай сусветнай і Грамадзянскай войнаў на гістарычную сцэну падняўся беларускі народ — мудры і цягавіты працаўнік, праўдзівы абаронца і захавальнік Радзімы.

Народ, які фактычна і быў гаспадаром гэтай зямлі, таму што ў жудасныя часы ўсіх войнаў (якіх было нямала) ён самаахвярна ўставаў на абарону Бацькаўшчыны і заўсёды ведаў, хто яе вораг. Нават не маючы палітычнай самастойнасці, стагоддзямі жывучы пад гнётам культурнай, канфесійнай і палітычнай экспансіі, ён здолеў захаваць сваю этнічную самабытнасць і традыцыі.

А гэта і ёсць незалежнасць — тая самая найвялікшая прага да сапраўднай волі, якая жыве ў сэрцы. Яна і дапамагае нам захаваць сувязь з продкамі, родны зямлёй, зберагчы нацыянальную ідэнтычнасць, веру і мову.

Менавіта сэрцам беларускі народ заўсёды выбіраў гістарычны шлях і тым самым даказаў, што заслугоўвае суверэннага права вяршыць свой лёс. Мы і толькі мы будзем вяршыць гэты лёс на гэтым кавалку зямлі.

Паважаныя таварышы!

У гэты святочны дзень мы заўсёды ўспамінаем савецкую эпоху, якая дала беларусам магчымасць упершыню ў сваёй гісторыі пабудаваць эканамічны фундамент будучай легітымнай дзяржавы — рэспубліку з усімі нацыянальнымі атрыбутамі: беларускімі сцягам, гербам і гімнам.

Але ў навейшы час наша пакаленне мае гонар рэалізаваць абсалютнае права на дзяржаўны суверэнітэт і незалежнасць. На шчасце, без крыві і ўзрушэнняў.

І мы зрабілі гэта, выбраўшы шлях пераемнасці палітычных, культурных і сацыяльных традыцый — свой, а не навязаны знешнімі сіламі гістарычны шлях. Шлях, які многім, як вы бачыце, ужо сёння не падабаецца. Але гэта наш шлях, мы яго выбралі. І мы будзем ісці гэтым шляхам, чаго б нам гэта ні каштавала. Я памятаю, год таму мы разважалі на гэту тэму, і ўжо тады я вас папярэдзіў, што суверэнітэт і незалежнасць — гэта самае дарагое, што ёсць у любога народа, і што суверэнітэт і незалежнасць дорага каштуюць. Калі мы хочам быць суверэннымі і незалежнымі, нам трэба ісці на гэта, спакойна, без узрушэнняў, не ўступаючы ў канфлікты ні з якімі суседзямі, далёкімі або блізкімі, — нам гэта не патрэбна, мы мірныя людзі і хочам жыць спакойна. Жыць за свой кошт, сваёй працай, нам чужога не трэба, але і свайго мы не аддадзім.

На рэспубліканскіх рэферэндумах у 1990-я беларускі народ падтрымаў моўную роўнасць і дату Дня Незалежнасці. Зрабіў выбар на карысць моцнай улады, здольнай забяспечыць бяспеку і стабільнасць дзяржаўнага развіцця. Дзіўна, але я апошнім часам усё часцей чую крытыку гэтай формы дзяржаўнага ладу нашай краіны. Я хачу некаторым, якія прысутнічаюць у гэтай зале, нагадаць, а моладзь, якая гэтага не ведае, праінфармаваць, што не я ўзяў і манапалізаваў гэту ўладу, узваліў на свае плечы непасільную ношу. Тады мы ўявілі крывавы абрубак вялікай дзяржавы — Савецкага Саюза. Ні грошай, ні мукі, каб хлеб спячы, вакол забастоўкі, каструлі, чайнікі, лыжкі.

# Наша будучыня залежыць толькі ад нас саміх

**Дзень Незалежнасці 3 ліпеня — гэта нагода не толькі ўспомніць тых, хто заваяваў нам права быць гаспадарамі на сваёй зямлі, але і падумаць пра тое, які ўнёсак можа зрабіць кожны з нас у прагрэсіўнае заўтра нашай краіны. Што ўсё ў нашых руках, казалі ўчора Прэзідэнт, калі звяртаўся з уступным словам да грамадзян на Плошчы Перамогі, прадстаўнікі ўлады, галоўныя героі падзеі — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны.**

Па традыцыі старт святочным мерапрыемствам не толькі ў сталіцы, але і па ўсёй краіне дае патрыятычнае шэсце «Беларусь памятае!». У Мінску ва ўрачыстасцях узяў удзел Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка з сынамі.

Калона амаль з пяці тысяч чалавек пачала рухацца ад Дзяржаўнага цырка па праспекце Незалежнасці да плошчы Перамогі. Наперадзе яе — рота ганаровай варты з кветкавай гірляндай у нацыянальных колерах. За вайскоўцамі па галоўнай вуліцы сталіцы прайшлі ветэраны Узброеных Сіл Беларусі, воіны-інтэрнацыяналісты, вышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі дзяржаўных органаў улады, дзеячы культуры, вядомыя спартсмены, піянеры, кадэты, маладзёжныя актывісты. За імі выстраіўся картэж аўтамабіляў УАЗ, дзе размясціліся шаноўныя госці свята — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, якіх суправаджалі падлеткі — іх праўнукі або тыя, хто шэфствуе над ветэранамі.

* * *

Да пачатку шэсця журналісты змаглі крыху пагаварыць з прадстаўнікамі ўлады і ветэранамі і павіншаваць іх са святам.

«Мы сёння ў першую чаргу аддаём даніну памяці, павагі, пакланення подзвігу нашых людзей, якія яго здзейснілі, каб мы жылі ў свабоднай, вольнай краіне, якая развіваецца і накіравана ў будучыню. Учора на святочным канцэрце рэтраспектыва паказала, што мы зрабілі за 26 гадоў нашага суверэнітэту, чаго дасягнулі ў сферы прамысловасці, сельскай гаспадаркі, як развіваюцца IT-сфера, навука. Мы сталі касмічнай краінай. У Беларусі забяспечваюцца сацыяльныя гарантыі — мы клапоцімся аб ветэранах, дзецях, шматдзетных сем'ях, малады людзях. І гэтае свята заўсёды выклікае прыўзнятыя пачуцці, гэта этап, пасля якога хочацца зрабіць у сваёй справе, на сваім месцы яшчэ больш», — сказаў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ГАЙДУКЕВІЧ** выказаў думку, чаму 3 ліпеня — найважнейшы дзень у календары: «Дзень Незалежнасці — галоўнае свята. Чаму? Гэта магчымасць беларусам самім вызначаць свой лёс. То-бок мы самі вырашаем, як нам жыць, самі вырашаем, у якія інтэграцыйныя аб'яднанні нам уступаць, мы самі вызначаем, якія будзем мы і наша краіна».

Парламентарый акцэнтаваў увагу на дасягненнях Беларусі, самае значнае з якіх тое, што мы стварылі сваю дзяржаўнасць. «Мы адбыліся як самастойная і незалежная краіна. Дасягнулі многага і пра гэта павінны гаварыць і памятаць, каб больш ніколі ў нашай гісторыі мы не пачыналі з пачатку», — упэўнены ён.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** падкрэсліў: «Мы павінны сваёй працай, мірам, згодай, узаемаразуменнем рабіць усё, каб краіна развівалася і мы захавалі тое, што зроблена за гады незалежнасці». Уладзімір Паўлавіч і падчас свята не забывае пра работу і дадае, што самае галоўнае сёння — гэта развіццё эканомікі.

**Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА** таксама падтрымаў такую думку: «Эканоміка — гэта залог дабрабыту насельніцтва, магчымасць развівацца і ісці наперад. Няма эканомікі — няма фундамента, на якім стаіць дзяржава», — канстатаваў кіраўнік урада. Гэтымі днямі на плошчы перад Палацам Рэспублікі выстаўлена тэхніка, створаная айчыннымі інжынерамі на працягу апошніх 20 гадоў. Дасягненні ў галіне машынабудавання за гэты час старшыня Саўміна назваў вялізным скачком. Ён быў зроблены на базе, якая засталася з савецкіх часоў, але мала хто сёння з постсавецкіх краін можа пахваліцца захаваннем прамысловасці і вывядзеннем яе на новы якасны ўзровень.

«Беларусь фактычна не страціла ніводнага буйнога прадпрыемства. Гэта, мабыць, і ёсць адно з дасягненняў незалежнасці, — сказаў прэм'ер-міністр. — Мы перажываем складаны эканамічны перыяд. Ён звязаны з тым, што мы адкрытая, экспартаарыентаваная эканоміка, якая завязана на знешнія рынкі. Мы звыш 60 працэнтаў прадукцыі павінны рэалізоўваць на экспарт, каб мець плацежны баланс, адпаведны нашым інтарэсам».

Але ў часы закрыцця рынкаў, па словах Рамана Галоўчанкі, мы знізілі ВУП менш, чым суседнія краіны, што валодаюць мацнейшай падушкай бяспекі. «Нам на іх фоне ўдаецца падтрымліваць больш пазітыўную карціну, а зараз мы бачым выхад на траекторыю росту. Будзем трымацца. У фундамент незалежнасці кожны павінен залажыць цаглінку на сваім месцы», — сказаў прэм'ер.

* * *

Ад сённяшніх спраў і перспектыў на заўтра пяройдзем да тых, хто заваяваў нам магчымасць казаць пра выбар самастойнага шляху, — ветэранаў. **Уладзімір БАРАДЗІН, былы артылерыст, гвардыі палкоўнік** акцэнтаваў увагу на сувязі Дня Незалежнасці і лёсу сталіцы і адзначыў, што радуецца таму, як вырас Мінск з пасляваенных часоў. «Перамога для мяне — гэта, па-першае, вызваленне горада і рэспублікі.

# МЫ ВЫБІРАЕМ СЭРЦАМ

## на ўрачыстым сходзе да Дня Незалежнасці

Людзі натоўпамі ішлі сюды, да Мінска — у сталіцу нашай радзімы, папрасіць хаця б дзесяць долараў, каб пракарміць сям'ю.

І тады я прапанаваў вам варыянты, не кулуарна, не маючы тады яшчэ ніякай абсалютна ўлады. І вы на рэферэндуме, падтрымаўшы мяне, узвалілі на мае плечы тады яшчэ маладога чалавека, гэту ношу. Як магу, так і нясу.

І павінен вам сказаць (прабачце за нясціпласць — гэта мы з вамі зрабілі): сёння вакол тыя, хто панеслі цяжкія страты ў гэты перыяд, чвэрць стагоддзя перабудовы, зайздросцяць беларусам, што яны спакойна прайшлі гэты шлях. Я гэта кажу, таму што сёння некаторым вельмі карціць, хочацца перавярнуць, рэформ. Толькі хачу вас папярэдзіць, што ў выніку гэтых рэформ хтосьці наб'е кішэні, а вы зноў з каструлямі будзеце хадзіць з вёсак і сёл, Салігорска, Слуцка і іншых гарадоў у горад-герой Мінск. Вы хочаце сказаць, што гэтага не будзе? Будзе. Паглядзіце на Амерыку — найбагацейшая краіна. Паглядзіце на Заходнюю Еўропу — ім чаго карціць? Паглядзіце, што робіцца: апошнія падзеі і пандэмія парадзілі ў Злучаных Штатах Амерыкі 60 млн беспрацоўных, галодныя бунты. Мы не Амерыка, мы не друкуем долары. Мы нават не Расія, якой няма куды дзяваць вуглевадароды, золата і металы. У нас толькі рукі, мазгі, галава на плячах. А для гэтага трэба, каб увесь свет працаваў, каб эканоміка ўсяго свету існавала. Калі эканоміка ўсяго свету закрыецца, закрыемся і мы, таму што мы экспартна арыентаваная эканоміка, таму што мы асноўную сыравіну і рэсурсы купляем з-за мяжы. Так жывуць многія сярэднія, малыя дзяржавы. Але для гэтага патрэбны мір, патрэбна ўзаемадзеянне. І мы ўсё робім для таго, каб узаемадзейнічаць.

Сёння Беларусь на разрыў. З Усходу нас баяцца страціць (і я гэта не ўтойваю, і разумею нашых братоў-расіян). Ды мы і бегчы нікуды не збіраемся: проста хочам, каб у нашым агульным доме, дзе мы жылі і жывём як браты, да нас ставіліся па-чалавечы. Вось адзінае патрабаванне, усё астатняе самі заробім.

З іншага боку, мы хочам, каб намі пастаянна не пануквалі: вы ж там глядзіце, не дапусціце таго і гэтага, выбары правядзіце, як мы, нікога там не чапайце. Нядаўна вызначыліся французы. Ці ім аб гэтым гаварыць, калі яшчэ «жоўтыя камізэлькі» з вуліц не пайшлі?

Ідзе страшная канкурэнтная барацьба, і нам, беларусам, у гэтай барацьбе трэба выстаяць, прайсці прыгожа. Трэба не стварыць сабе праблемы, і да канца года мы выйдзем на той шлях развіцця, па якім ішлі заўсёды. Цяпер вострая барацьба, і яе абвастрыла не тое рукатворная, не тое выпадковая пандэмія. Але, як вы разумееце (асабліва людзі старэйшыя), выпадковага ў гісторыі нічога не бывае. І хутка вы гэта зразумееце, як зразумелі той асаблівы шлях, з якім мы ўступілі ў барацьбу з гэтай каранавіруснай інфекцыяй. Як вы мне не верылі тры месяцы таму, калі я вам гаварыў многае, жартуючы і не жартуючы. Вы хутка ў гэтым пераканаецеся. Шмат чаго я публічна вам нават сказаць не магу.

Проста будзьце акуратнымі і асцярожнымі. Мы гэта павінны зрабіць, каб заўсёды, як сёння, будаваць самастойна незалежную на міжнароднай палітычнай арэне краіну. Краіну сучасную і ўнікальную ў сваім спалучэнні заходне- і ўсходнееўрапейскай культур. Яны — наша агульная гістарычная спадчына.

Тое, што за гады незалежнасці мы змаглі захаваць у грамадстве гармонію розных традыцый і моў, навучыліся прымаць і цаніць дасягненні розных гістарычных эпох, паважаць канфесійны выбар адзін аднаго, сведчыць аб нацыянальнай і палітычнай сталасці нашага народа. Гэта значыць мы гатовы канчаткова пабудаваць нашу незалежную краіну.

Шматвяковая гісторыя краіны прадвызначыла нашу духоўную блізкасць з брацкімі народамі, нашу знешнеэканамічную, знешнепалітычную шматвектарнасць. Мы з'яўляемся не толькі гістарычным, але і сучасным цэнтрам Еўропы. За чвэрць стагоддзя мы сфарміраваліся ў культурна і духоўна адзіны незалежны беларускі народ.

Час ставіць нас перад новым выклікам. Выклікам, які выпрабоўвае на трываласць многія дзяржавы, саюзы, а таксама дружалюбныя і эканамічныя адносіны паміж краінамі. Свет на мяжы змены эпох, якая зноў падзеліць яго гісторыю на да і пасля.

І кожны чалавек, які думае, задаецца сёння пытаннем: якое месца ў геапалітычнай прасторы ў бліжэйшым будучым зойме Беларусь? Не будзе пытання: «Хто мы? А хто там ідзе?» Будзе адно пытанне: «Дзе мы, дзе наша месца?» Месца наша тут, і, чаго б нам ні каштавала, нам трэба адстаяць яго. Яно належыць ужо не столькі нам, колькі нашым дзецям.

У свеце ідзе барацьба. Жорсткая. Нават бязлітасная. За тэрыторыі, рэсурсы, рынкі збыту, за гістарычную спадчыну і сферы ўплыву. Мы ўпершыню за ўсю гісторыю незалежнасці знаходзімся пад прэсам беспрэцэдэнтнага інфармацыйнага націску. На коне бяспека людзей і суверэнітэт дзяржавы.

Я кажу адкрыта і без двайных сэнсаў: праз месяц ужо мы будзем вызначаць лёс нашай краіны. Калі толькі мы пойдзем па навязаных сцэнарыях услед за тымі, кім кіруюць замежныя ляльчнікі, перастанем быць беларусамі. Беларусамі, якія ў самы цяжкі час выходзілі пераможцамі. Беларусамі, якія заўсёды ставіліся з вялікай павагай да таго, што было зроблена папярэднікамі. Беларусамі, якія заўсёды абапіраліся на спрадвечныя традыцыі ў культурным, навуковым, вытворчым, палітычным і грамадскім жыцці краіны.

Менавіта гэта пераемнасць зрабіла нас незалежным народам, самадастатковым і самастойным у выбары свайго лёсу. І сёння як ніколі мы павінны моцна трымаць у руках сваё мінулае, сучаснае і, галоўнае, будучае. Мы павінны захаваць суверэнітэт краіны, яе незалежнасць!

І апошняе. Праз месяц вы і толькі вы будзеце вызначаць не тое, хто будзе Прэзідэнтам, — гэта прасцей за ўсё. Вы будзеце вызначаць будучыню сваёй краіны. Мы з вамі пражылі разам чвэрць стагоддзя, як умелі, будавалі нашу Беларусь, як умелі, стваралі і гадавалі нашу моладзь, якая, на жаль, разнародная, але так было заўсёды. На яе крыўдзіцца няма чаго. Калі дзесьці яна не такая, значыць, не дапрацавалі мы.

Старэйшае, сярэдняе пакаленні, тыя, хто працуе, жыве, як і асноўная маса людзей, правільна ацэньваюць сітуацыю ў краіне. І я ўсё больш сустракаюся з людзьмі, якія думаюць, разумнымі, талковымі працаўнікамі, усё больш і больш адчуваю нейкі жаль да сябе. Яны спрабуюць мяне ў чымсьці супакоіць. Дык вось, я вам скажу галоўнае (проста вярну вас у тое, аб чым заўсёды гаварыў): я ўжо напрацаваўся, я ўжо наеўся гэтай прэзідэнцкай долі.

Я ў гэтай прэзідэнцкай кампаніі не таму, што, учапіўшыся, трымаюся за гэта крэсла пасінелымі пальцамі. Я лепшыя гады свайго жыцця, як і многія з вас, аддаў будаўніцтву гэтай краіны. Як маглі, як мог, так і будавалі. Як аказалася, не горш за іншых. Галоўнае, мы пазбеглі войнаў, жывём у бяспечнай, спакойнай краіне, дзе кожны, хто мае дзіця, можа выйсці на вуліцу ў любы час сутак і быць спакойным. Нам зайздросцяць людзі з іншых краін: нашы браты-расіяне, украінцы. А мы жывём і не разумеем, як гэта нам дасталося.

Гэта зрабілі мы з вамі, таму 9 жніўня без усялякага жалю (не трэба глядзець на Лукашэнку, што вось ён наш, ён з намі быў — жаль нам не саюзнік) вы павінны, як у народзе кажуць, узяць галаву ў рукі, падумаць і вырашыць пытанне. Лукашэнкі прыходзяць і сыходзяць, будуць іншыя. Ён не вечны, а жыццё на гэтым кавалку зямлі павінна працягвацца. Таму адкіньце ўсе эмоцыі. Сёння не да эмоцый, сёння гуляюць на вашых і маіх эмоцыях, выкарыстоўваюць так званыя новыя тэхналогіі, інтэрнэт і іншае. Мы павінны паказаць, што мы беларусы і добра разбіраемся ва ўсялякіх інтэрнэтаўскіх хітрыках. Мы павінны дастойна прайсці гэты перыяд, а вы павінны вызначыць, з кім вы будзеце далей жыць і як будзеце будаваць сваю суверэнную незалежную краіну для сваіх дзяцей.

Дарагія сябры!

Дазвольце мне ў гэты дзень павіншаваць вас з Днём Незалежнасці, павіншаваць вас з тым, што мы з вамі пабудавалі сваімі рукамі. Няхай гістарычнае значэнне гэтай памятнай даты дае кожнаму новаму пакаленню беларусаў веру ў сябе, натхняе на новыя здзяйсненні ў імя нашай роднай Беларусі і міру на зямлі.

Моцнага вам здароўя, шчасця і дабрабыту!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ВІНШАВАННІ З УСЯГО СВЕТУ

Віншаванні з Днём Незалежнасці паступілі на адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і беларускага народа ад кіраўнікоў замежных дзяржаў, замежных палітычных і грамадскіх дзеячаў, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўніка дзяржавы і беларускі народ павіншавалі Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш, Папа Рымскі Францыск, лідары Расіі, Кітая, ЗША, Індыі, Казахстана, Сербіі, Арменіі, Азербайджана, Украіны, Туркменістана, Малдовы, Таджыкістана, Узбекістана, Кыргызстана, Францыі, Германіі, Вялікабрытаніі, Швейцарыі, Швецыі, Латвіі, Нідэрландаў, Балгарыі, Аўстрыі, Італіі, Сан-Марына, Венгрыі, Эстоніі, Турцыі, ААЭ, Бахрэйна, Чэхіі, Японіі, Сінгапура, Рэспублікі Карэя, В'етнама, Ірана, Кубы, Венесуэлы, Пакістана, Егіпта, Манголіі, Зімбабвэ, Кеніі, Намібіі, КНДР, Дзяржавы Палесціна.

З таго моманту пачалося яго адраджэнне пасля нямецкага нашэсця. Мы ўсе рабілі ўнёсак у аднаўленне горада, а сёння радуемся мірнаму часу і прыгожай сталіцы».

**Іван СІНЕЛЬШЧЫКАЎ** падкрэсліў, што Беларусь заслужыла незалежнасць сваёй працай, партызанскім рухам і нашым укладам жыцця. «І правільна Прэзідэнт падымае сёння патрабаванні да народа, арміі. І мы, ветэраны, разумеем сваю адказнасць, бо прадстаўляем армію», — дадаў ветэран авіяцыі. Па яго словах, гэты дзень для яго асаблівы: «З учарашняга дня рыхтаваў мундзір, перажываў. Сэрцайка б'ецца ад хвалявання».

На плошчы Перамогі для 50 ветэранаў размясцілі пляцоўку з крэсламі. Побач з імі — прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса. У канцы цырымоніі «Беларусь памятае!» Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка паразмаўляў з ветэранамі.

* * *

Апоўдні ў Мінску стартавалі забаўляльныя мерапрыемствы: на пляцоўцы каля Палаца спорту можна было падсілкавацца на фуд-корце, падзівіцца і набыць вырабы на выстаўцы-кірмашы «Зроблена ў Беларусі». Дарэчы, ён працягвае працаваць сёння і заўтра.

А дзявятай гадзіне вечара каля стэлы «Мінск — горад-герой», дзе падрыхтавалі святочны гала-канцэрт «Беларусь бязмежная», гараджан чакалі артысты беларускай эстрады і харэаграфічныя калектывы.

Пасля святломузычнага фантаннага шоу на набярэжнай Свіслачы неба Мінска расквеціў святочны феерверк, залпы якога выпусцілі ў васьмі месцах горада. Мерапрыемствы, прысвечаныя Дню Незалежнасці, прайшлі ва ўсіх раёнах беларускай сталіцы.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ЭПІЦЭНТРЫ СВЯТА

**У Дзень Незалежнасці па ўсёй краіне прайшлі святочныя мерапрыемствы. Па добрай традыцыі ў гэты дзень у якасці падарункаў жыхарам вялікіх гарадоў і маленькіх населеных пунктаў прымяркоўваюць адкрыццё значных аб'ектаў. Сёлета, напрыклад, у Брэсце пачала дзейнічаць новая экспазіцыя ў Брэсцкай крэпасці, у Магілёве запушчаны ў эксплуатацыю басейн у сярэдняй школе ў Казіміраўцы, а ў сталіцы — «музычны» фантан. Больш падрабязна аб тым, як сустрэлі свята ў рэгіёнах, у матэрыялах нашых уласных карэспандэнтаў.**

● БРЭСТЧЫНА

## Дзіцячы садок і экспазіцыя ў Брэсцкай крэпасці

У Брэсце святкаванне Дня Незалежнасці па традыцыі пачалося з ускладання кветак да Вечнага агню ў крэпасці і да помніка воінам-вызваліцелям. Пасля цырымоніі была ўрачыста адкрыта новая экспазіцыя «Абарона Усходняга форта» ў Брэсцкай крэпасці. Экспанаты для яе экспазіцыі назапашваліся дзесяцігоддзямі. І вось цяпер яны сталі даступныя для прагляду экскурсантаў і наведвальнікаў.

Да свята на Брэстчыне прымеркавана адкрыццё цэлага шэрагу аб'ектаў. Толькі ў Пінскім раёне пачынаюць работу тры новыя прадпрыемствы і ўстановы. У Парахонску чырвоную стужку перарэзалі перад уваходам у дзіцячую школу мастацтваў, якая адкрылася пасля рэканструкцыі. Пункт сарціроўкі і перапрацоўкі ягад ААТ «Палеская журавіны» запрацаваў у вёсцы Селішча, а ў Дубнавічах гэтага раёна ўвялі ў строй магутны малочнатаварны комплекс.

У Ганцавічах гледачы прыйшлі на святочны сеанс у новы кінатэатр «Маладосць». Новым ён стаў пасля рэканструкцыі. А напярэдадні свята ў вёсцы Скокі Брэсцкага раёна адкрылі такі патрэбны і чаканы сацыяльны аб'ект — дзіцячы сад. Са знамянальнай падзеяй выхаванцаў і іх бацькоў павіншаваў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС. Губернатар адзначыў, што ў краіне і рэгіёне ўдзяляецца вялікая ўвага падрастаючаму пакаленню:

— Летась былі ўзведзены вялікія дашкольныя ўстановы ў Баранавічах і Пінску, два гады таму адкрылі сад на 350 месцаў у Брэсце, летась — школу-сад. Пачынаюцца праектныя работы па школе-садзе ў Тэльмах Брэсцкага раёна. У новых мікрараёнах гарадоў укараняецца вопыт размяшчэння дзіцячых садкоў на першых паверхах новых дамоў. Летась такі адкрылі ў Драгічыне, яшчэ адзін узводзіцца ў Брэсце.

● ВІЦЕБШЧЫНА

## Як святкуе Прыдзвінне?

У Віцебску галоўнае святкаванне (калі ўлічыць маштабнасць падзей) па традыцыі праходзіць на плошчы Перамогі.

Кіраўнікі абласной вертыкалі ўлады на чале са старшынёй аблвыканкама Мікалаем ШАРСНЁВЫМ усклалі кветкі да Вечнага агню. Сёлета на плошчы правялі афіцыйную цырымонію адкрыцця абласной дошкі Гонару. Раней гэты знакавы аб'ект знаходзіўся ў парку, насупраць помніка Леніна. І даўно ўжо было заўважна, што неабходна мадэрнізаваць дошку, зрабіць так, каб пасля рамонту яна адпавядала патрэбам часу. Мясцовая ўлада вырашыла, што на плошчы Перамогі, якая сапраўды вельмі прыгожая і стыльная, самае месца і дошцы Гонару.

А ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі абнавілі тэматычную выстаўку, прысвечаную Вялікай Айчыннай вайне. Можна больш падрабязна даведацца пра тое, што адбывалася ў Віцебску і наваколлях у 1941—1944 гадах. Вызваліцеляў тады сустракалі ўсяго каля 120 жыхароў. Вялікі інтарэс выклікае і тэма аднаўлення абласнога цэнтра...

Ва ўсіх буйных населеных пунктах праводзяць святочныя мерапрыемствы. А людзей здалёк — з маленькіх вёсачак, хутароў — запрасілі на святы ў аграгарадкі і пасёлкі.

● ГОМЕЛЬШЧЫНА

## Для жыцця і трэніровак

На Гомельшчыне святочныя мерапрыемствы да Дня Незалежнасці прайшлі ва ўсіх раёнах рэгіёна. У абласным цэнтры старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця адной з найлепшых навучальна-трэніравальных баз абласнога вучылішча алімпійскага рэзерву. Так, у Гомелі пасля працяглых работ па рэканструкцыі адкрыты спартыўны комплекс па вуліцы Партовай.

Генадзь Салавей адзначыў, што абноўлены аб'ект — прыемны падарунак гараджанам да Дня Незалежнасці. І такіх сацыяльна значных наваселляў напярэдадні свята і непасрэдна ў гэты дзень для жыхароў вобласці падрыхтавалі нямала:

— Амаль 250 дзяцей прынялі абноўленыя дзіцячыя сады ў Гомельскім і Петрыкаўскім раёнах. Першых гледачоў сустракае пасля маштабнай рэканструкцыі Мазырскі драматычны тэатр. Аднавіў дзейнасць Палац культуры ў Камунары Буда-Кашалёўскага раёна, — падкрэсліў старшыня аблвыканкама.

Адкрыццё пасля рэканструкцыі спартыўнага комплексу па вуліцы Партовай — працяг шэрагу значных адкрыццяў спартыўных аб'ектаў у рэгіёне.

— За год мы адкрылі лыжаролерную трасу і крыты футбольны манеж у Гомелі, стадыён у Петрыкаве і басейн у Мазыры. Пры комплексным добраўпарадкаванні раённых цэнтраў абавязковай умовай стала стварэнне спартыўных пляцовак для моладзі. Усё гэта пашырае магчымасці для ўсіх ахвотных і яшчэ больш актывізуе спартыўнае жыццё рэгіёна, — падкрэсліў Генадзь Салавей.

Абноўлены спарткомплекс у Гомелі будзе выкарыстоўвацца для трэніровак па плаванні, лёгкай атлетыцы, фехтаванні, сучасным пяцібор'і, скалалажанні, дзюдо, грэка-рымскай і вольнай барацьбе, веласпорце і гульнявых відах спорту. Адначасова ва ўстанове змогуць займацца фізічнай культурай і спортам 145 чалавек.

Яшчэ адным падарункам для гамяльчан да свята стала адкрыццё пасля рэканструкцыі вуліцы Шаўчэнкі. Гэта вельмі важны для горада транспартны кірунак — палёгка для аўтамабілістаў, якія са значнай часткі мікрараёнаў горада цяпер змогуць хутчэй дабірацца да цэнтральных вуліц, чыгуначнага і аўтавакзала.

● ГРОДЗЕНШЧЫНА

## Загс у Ваўкавыску, экспазіцыя ў вежы Гедыміна...

Гістарычны цэнтр абласнога цэнтра стаў месцам асноўных святочных падзей. Пачатак быў дадзены традыцыйным мітынгам у парку Жылібера, дзе каля помніка загінулым воінам гарыць Вечны агонь.

Тэма памяці ўвасоблена ў габелене «Гісторыі жывая ніць», прэзентацыя якога адбылася з удзелам аўтараў на вуліцы Савецкай. Палатно памерам два метры на паўтара мог убачыць кожны, хто завітаў на свята. Пешаходная вуліца — традыцыйнае месца святочных мерапрыемстваў. Сёлета тут упершыню будзе праходзіць самы працяглы праект «Канцэрт на балконе», які нядаўна ўвайшоў у гарадское культурнае асяроддзе і вельмі падабаецца гараджанам і гасцям горада. Паводле творчага праекта мастакоў і фотамайстроў узнікла алея-выстаўка на Савецкай плошчы. У работах увасоблены вобраз старажытнага Гродна ў розных выявах. Як адзначыў арганізатар галерэі Аляксандр ЛАСМІНСКІ, для паказу выбраны найлепшыя фотаздымкі і жывапісныя работы на тэму горада.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

А вось у культурнай сталіцы Беларусі — горадзе Лідзе — сёння пачала дзейнічаць новая экспазіцыя. Яна адкрыта ў аднооўленай вежы Гедыміна ў Лідскім замку. Выстаўка знаёміць з эпохай, калі быў заснаваны адзіны на сённяшні дзень адноўлены замак-кастэль у Беларусі. Экспанаты займаюць чатыры ярусы, дзе можна даведацца пра асобу Гедыміна — заснавальніка замка, аб станаўленні Вялікага Княства Літоўскага. Таксама перастрораны і княжацкі пакой з адпаведнымі XIV стагоддзю рэчамі. Дарэчы, менавіта тэрыторыя замка стала эпіцэнтрам свята.

Адной са значных падзей мерапрыемства, безумоўна, стала ўрачыстае адкрыццё абноўленага Загса ў Ваўкавыску. Да гэтага рэгістрацыі шлюбаў праводзіліся ў раённым Палацы культуры. Цяпер для ўрачыстай цырымоніі створаны больш камфортныя ўмовы. Прадугледжана бездар'ернае асяроддзе і зручная паркоўка для шлюбных картэжаў. Сродкі на рамонт выдаткаваны з раённага бюджэту, у тым ліку сабраныя на раённых суботніках.

Добрыя падарункі да свята зрабілі гродзенскія будаўнікі і дарожнікі. Адным з даволі зручных аб'ектаў стаў новы падземны пешы пераход у паўночным мікрараёне Гродна, які злучыў тэрыторыю актыўнай забудовы Грандзічы з больш абжытымі Белымі Росамі. Пераход прайшоў пад высокім насыпам з чыгункай. Дарэчы, гэты мікрараён нядаўна атрымаў яшчэ адзін тралейбусны маршрут, ён працягнецца праз увесь горад да паўднёвага мікрараёна Альшанка.

● МАГІЛЁЎШЧЫНА

## Для дарослых і дзяцей

Запушчаны ў эксплуатацыю басейн СШ № 46 Магілёва — урачыстая цырымонія адкрыцця аб'екта адбылася 1 ліпеня ў рамках святкавання Дня Незалежнасці.

Басейн стаў другім этапам праекта, у рамках якога у 2019 годзе была здадзена ў эксплуатацыю сама сучасная ў горадзе сярэдняя школа на 1200 месцаў у жылым раёне абласнога цэнтра — Казіміраўцы, а таксама вынікам рэагавання на просьбы жыхароў.

Сёння Казіміраўка — жылы мікрараён з развітой інфраструктурай. Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ падзякаваў будаўнікам, якія працавалі на аб'екце, за працу, якасць і тэмп, што дазволілі раней нарматыўных тэрмінаў здаць у эксплуатацыю басейн, тым самым зрабіць доўгачаканы падарунак жыхарам мікрараёна.

Будынак басейна ўяўляе сабой двухпавярховае памяшканне. На першым паверсе размешчаны чаша басейна працягласцю 25 метраў і сем дарожак, а таксама раздзявальні, душавыя, медкабінет. На другім — трэнажорная зала з сучасным наборам абсталявання для дарослых і дзяцей. Басейн будзе выкарыстоўвацца як вучэбная база сярэдняй школы, а таксама тут плануецца арганізацыя наведвання для ўсіх ахвотных, якія пражываюць у мікрараёне.

● МІНШЧЫНА

## Жыллё для шматдзетных і сучасная крама

У гэты дзень кветкі і вянкі ад дэлегацый Мінскай вобласці ляглі да падножжа мемарыяльных комплексаў «Хатынь» і «Курган Славы», гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна». Старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН, прадстаўнікі дэпутацкага корпуса і грамадскіх арганізацый прынялі ўдзел у патрыятычным шэсці «Беларусь памятае» ў Мінску на праспекце Незалежнасці і плошчы Перамогі.

Затым кіраўнік цэнтральнага рэгіёна ўсклаў кветкі да брацкай магілы воінаў Чырвонай Арміі, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у гарадскім скверы ў Беразіне. Пасля гэтага губернатар урачыста ўручыў ключы шчаслівым навасёлам 40-кватэрнага жылога дома. Тут атрымалі кватэры 38 шматдзетных сем'яў.

У Барысаве ўведзены ў дзеянне пяць жылых дамоў на вуліцы Гарадоў-пабрацімаў. Навасёлам ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаны ключы ад новых кватэр. Падзею прымеркавалі да Дня вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дня Незалежнасці Беларусі. У пяці кааператыўных дамах налічваецца 165 кватэр, 39 з іх будаваліся за кошт Мінаблвыканкама для адсялення людзей, які пражывалі ў старых, непрыдатных дамах. Яшчэ 124 прызначаны для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і стаяў на чарзе, у тым ліку — 84 для шматдзетных сем'яў, дзе гадуецца трое і больш дзяцей.

Амаль два гады ў Дзяржынску на вуліцы Мінскай ішло будаўніцтва новага магазіна «Дамашні». І вось напярэдадні свята ён расчыніў дзверы для наведвальнікаў. Гэта першы такі аб'ект гандлю ў горадзе. Тут можна набыць усе неабходныя тавары для харчовых і бытавых патрэб. Будаўніцтва новай крамы пацягнула за сабой і ўладкаванне інфраструктуры. Сучасны выгляд набыў аўтобусны прыпынак, праз дарогу з'явілася дадатковая стаянка для аўтатранспарту.

У Мар'інай Горцы пабудаваны сучасны плавальны комплекс, якога так даўно чакалі жыхары Пухавіцкага раёна. У спартыўна-аздараўленчым цэнтры прадугледжаны дзіцячы і дарослы басейны, устаноўка для гідрамасажу, трэнажорнае крэсла для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Ёсць фінская саўна і турэцкі хамам, а таксама невялікі басейн з халоднай вадой, пакой адпачынку.

**Вольга АНУФРЫЕВА, Святлана ЯСКЕВІЧ, Аляксандр ПУКШАНСКІ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Маргарыта УШКЕВІЧ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# УСПАМІНАЕМ КЛАСІКУ

**На наступным тыдні, 7 ліпеня, наша краіна будзе адзначаць 138-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы. З гэтай нагоды тэлеканал «Беларусь 3» падрыхтаваў тэматычны эфір. Акрамя таго, гледачоў сацыякультурнага тэлеканала чакае прэм'ера — канцэрт ансамбля «Песняры»!**

У дзень нараджэння народнага паэта мы пачуем у міжпраграмных блоках на «Беларусь 3» яго вершы ў выкананні вядомых беларусаў, а ў 14.45 выйдзе фільм «Янка Купала: адзіная Паўлінка» з цыкла «Запіскі на палях». У 15.10 канал пакажа канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам прафесара Міхаіла Фінберга «Купала і Колас, вы нас гадавалі».

А вось у суботу 11 ліпеня ў 17.30 «Беларусь 3» прапануе гледачам новую канцэртную праграму Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры», якую Белтэлерадыёкампанія запісала ў рамках сумеснай з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь эфірнай акцыі «Майстры культуры — ветэранам». Нагадаем, увесь юбілейны год Вялікай Перамогі сацыякультурны тэлеканал будзе пераносіць на экраны мінскія тэатральныя сцэны і канцэртныя залы.

# ЖЫЦЬ ПА-ІНШАМУ

**На «Беларусь 2» у ліпені чакаецца прэм'ера новага сезона рэаліці-шоу «Паненка-сялянка». Яго героіні — гэта дзяўчаты з розным дастаткам (адна забяспечаная, а другая — яе поўная супрацьлегласць), і на праекце кожная мае магчымасць паспрабаваць жыць па-іншаму.**

Паводле правілаў праграмы, у кожным выпуску дзве героіні прымяраюць на сябе жыццё адна адной. Багатая паненка едзе на тры дні ў сям'ю «сялянкі» і жыве па яе правілах, распарадку дня і на грошы, пакінутыя загадзя (альбо і без іх), а другая дзяўчына, наадварот, атрымлівае шанц убачыць, што значыць быць заможнай — мець іншае асяроддзе, працаваць у сваё задавальненне і не лічыць кожную капейку. Потым у фінале героіні сустрэнуцца і падзеляцца сваімі ўражаннямі, назіраннямі і высновамі.

Па задуме аўтараў шоу, такія перамены ў жыцці гераінь дапамогуць ім пераасэнсаваць тое, што яны маюць цяпер, і зразумець, куды ім варта рухацца ў перспектыве. Сачыце ў тэлепраграме за датай прэм'ернага выпуску ў эфіры «Беларусь 2».

**Алена ДРАПКО.**

# ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 117

21 чэрвеня пачаўся новы анлайн-турнір пад эгідай Сусветнай федэрацыі шашак (FMJD) — Кубак нацый па шашках-100. У спаборніцтвах сярод жанчын возьмуць удзел 11 каманд, якія згуляюць па кругавой сістэме. Шэсць найлепшых зборных трапяць у плэй-оф. У мужчын згуляюць 26 зборных па швейцарскай сістэме ў сем тураў, 14 найлепшых каманд будуць змагацца ў плэй-оф. Нашы гульцы пачалі з перамог: жаночыны перайгралі каманду Нідэрландаў 6:2, мужчыны былі мацнейшыя за эстонцаў 7:1. У другім туры мужчынская зборная Беларусі перамагла каманду Сенегала з лікам 6:2.

Дзеючы чэмпіён свету і Еўропы Ігар Міхальчанка (Ваўкавыск) выйграў анлайн-турнір па рускіх шашках памяці заслужанага трэнера Украіны, майстра спорту СССР Уладзіміра Вайсера. Турнір адбыўся на сайце https://www.playok.com/.

Паглядзіце фрагмент з анлайн-партыі.

№ 63 Dekimpe — Аникеев

Белыя простыя шашкі: 46, 48, 49, 42, 44, 45, 36, 37, 38, 39, 40, 32, 35, 27, 29, 25 (16)

Чорныя простыя шашкі: 26, 21, 16, 18, 11, 13, 14, 15, 6, 7, 8, 9, 10, 2, 3, 5 (16)

Белыя мелі магчымасць правесці ўдар.

1. 37-31? 26:28 2. 29-23 21:34 3. 23:01

Прапануем нашым чытачам ацаніць наступствы гэтай камбінацыі і вызначыць вынік.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

№ 64



№ 64

Белыя простыя шашкі: a1, e1, f2, h2, c3, e3, a7 (7)

Чорныя простыя шашкі: h4, c5, g5, b6, d6, b8, d8 (7)

№ 65

| **20** | Профильно-шлифовальный станок 395М, инв. № 50015 | **1 350,00** | 135,00 |
| **21** | Радиально-сверлильный станок 2Л53У, инв. № 50100 | **1 380,00** | 138,00 |
| **22** | Станок заточной 3К-634, инв. № 50392 | **390,00** | 39,00 |
| **23** | Станок 1В340Ф30, инв. № 50378 | **2 910,00** | 291,00 |
| **24** | Станок 1В340Ф30, инв. № 50374 | **2 070,00** | 207,00 |
| **25** | Станок мод.1В310Ф30, инв. № 50368 | **2 910,00** | 291,00 |
| **26** | Станок мод.1В310Ф30, инв. № 50365 | **2 490,00** | 249,00 |
| **27** | Станок токарно-винторезный НВ340Ф30, инв. № 50390 | **2 070,00** | 207,00 |
| **28** | Станок ГПМ 16А20Ф3РМ-139, инв. № 50359 | **2 880,00** | 288,00 |
| **29** | Станок ГПМ 16А20Ф3С-139, инв. № 50354 | **2 070,00** | 207,00 |
| **30** | Станок радиально-сверлильный ГС 545, инв. № 60978 | **6 150,00** | 615,00 |
| **31** | Станок токарно-револьверный 1Е365БП, инв. № 50391 | **1 650,00** | 165,00 |
| **32** | Станок токарно-револьверный 1П-365, инв. № 50084 | **1 410,00** | 141,00 |

**__Продавец:__** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Школьная, 8. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 303-53-09 Григорович Павел Карлович.** **__Шаг аукционных торгов –__** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. **Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**; **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 4 июля 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13 июля 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

**__В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того__**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **__5 (пять) %__**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **__5 (пяти) рабочих дней__** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **30 (тридцати) рабочих дней** и произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **__5 (пяти) рабочих дней__** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607). Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от **27.09.2019 г. № 184 (29051)**. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

## ИЗВЕЩЕНИЕ (ИНФОРМАЦИЯ) О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 31 июля 2020 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 285-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский**, тел.: +375 (17) 225 61 21, +375 (17) 225 69 77 | | | | | | |
| 73 | г. Минск, ул. Вокзальная, 26В | 11,33 | 22,66 БАВ | 47,87 | Под организацию розничной торговли продовольственной группой товаров | 4,70 | Площадь в пешеходном тоннеле под конкорсом (с выходом на Южную площадь). **Срок аренды – 3 года** (15*) |
| | 15* Год постройки – 1955, год реконструкции – 2003. Имеется естественное освещение. Центральное отопление отсутствует. Рядом расположены остановки городского транспорта (ул. Дружная), пригородного и междугороднего автобусного сообщения, станция метро «Площадь Ленина». Необходимые условия: разработка и согласование установленным порядком проектно-сметной документации, проведение строительно-монтажных работ и ввод в эксплуатацию торгового павильона. Все работы и мероприятия за счет средств арендатора без последующей компенсации затрат | | | | | | |
| 74 | г. Минск, пл. Привокзальная, 7 | 1,0 | 6,0 БАВ | 4,23 | Под установку вендингового снекового аппарата | 0,40 | Площадь в зале ожидания конкорс. Перечень наполнения вендингового аппарата согласовывается с арендодателем. **Срок аренды – 3 года** (16*) |
| | 16* Имеются центральное отопление, естественное освещение пожарная сигнализация и видеонаблюдение, включенные в общую систему вокзального комплекса. Вход общий. В ТЦ «Галилео» имеется платная парковка. Рядом расположены остановки городского транспорта, пригородного сообщения, автовокзал, метрополитен «Станция площадь Ленина» | | | | | | |

Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. + 375 (17) 327 40 22.

Аукцион состоится **__31 июля 2020 г. в 11.00__** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 1 июля 2020 г. по 27 июля 2020 г. включительно** в рабочие дни с __9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30__) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в аукционе:**

к участию в аукционе допускаются юридические или физическое лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий расчетный счет сумму задатка по соответствующему предмету аукциона, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах и получившие билеты участников аукциона с указанием порядковых номеров, под которым данные лица зарегистрированы.

__При этом лицо, желающее принять участие в аукционе:__

*- уплачивает задаток по соответствующему предмету аукциона на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, получатель платежа – государственное предприятие «МГЦН», назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 285 от 31.07.2020 по предмету аукциона № ___;*

- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе (бланк заявления можно получить у организатора аукциона) с приложением следующих документов:

*юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:*

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

*юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:*

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

*индивидуальный предприниматель:*

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

*физическое лицо* – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

- заключает с организатором аукциона соглашение, бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность, а представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Порядок определения победителя аукциона:**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион по каждому предмету аукциона начинается с объявления аукционистом наименования, места нахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):**

- подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

- в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

- в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);

- в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

**Дополнительная информация:**

- возможность осмотра имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, обеспечивает арендодатель;

- организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы и коммунальных платежей, а также ознакомиться с проектом договора аренды имущества;

- юридические лица и индивидуальные предприниматели производят оплату задатка исключительно платежным поручением;

- при отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении;

- организатор аукциона в течение 5 рабочих дней со дня его проведения возвращает участникам аукциона, за исключением случаев, предусмотренных Положением, внесенные ими задатки (сумма задатка, внесенного победителем аукциона, засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона);

- договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом), заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается;

- базовая арендная величина (БАВ) с 01.04.2019 до 30.09.2020 составляет 16,90 рубля.

**Телефоны для справок:** отдел аукционов: + 375 (17) 327 40 22, бухгалтерия: + 375 (17) 328 36 58, отдел аренды: + 375 (17) 327 47 29.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы на право аренды помещений»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»)

Культасвета

# СІМВАЛЫ НАТХНЕННЯ

**Напярэдадні Дня Незалежнасці ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея — Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці — ушанавалі пераможцаў і прызёраў адкрытага конкурсу «Сімвалы маёй краіны». Творчае спаборніцтва, якое было прымеркавана да 25-годдзя зацвярджэння Дзяржаўнага герба і сцяга Беларусі, доўжылася з 3 лютага да 17 мая і сабрала звыш 70 работ з розных рэгіёнаў нашай краіны. Арганізацыйную падтрымку яму аказалі Міністэрства культуры і ГА «Белая Русь», а адным з інфармацыйных партнёраў выступіў Выдавецкі дом «Звязда», таму, натуральна, мы не маглі абмінуць урачыстую цырымонію ўзнагароджання лаўрэатаў.**

«Сярод удзельнікаў праекта — людзі розных узростаў і розных прафесій, жыхары розных рэгіёнаў Беларусі, — зазначае **дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Павел САПОЦЬКА.** — І для нас прыемна, што, па-першае, ёсць інтарэс да конкурсу, ён атрымаўся насамрэч рэспубліканскі, а па-другое, што ў такой няпростай і важнай тэме ўдзельнікі прадэманстравалі столькі цікавых крэатыўных ідэй, якія ўвасобіліся ў адметныя мастацкія ініцыятывы».

Пластылін, фарбы, алоўкі, папера, дрэва, тканіна і ніткі, шкло, фетр, стужкі, фаамі-ран — прытрымліваючыся вядомых кожнаму выяў дзяржаўных сімвалаў, удзельнікі праявілі крэатыў у выкарыстанні матэрыялаў і мастацкіх тэхнік. У ліку самых кранальных — дзіцячыя малюнкі, аўтарам якіх усяго па сем гадоў, сярод найбольш уражальных — маштабныя калектыўныя работы, над якімі навучэнцы школ і каледжаў, працоўныя калектывы, сем'і працавалі шмат дзён. Зрэшты, кожная з работ лаўрэатаў, якія трапілі на выніковую выстаўку конкурсу, прыцягвае ўвагу, мае сваю адметную гісторыю і цікавыя рашэнні. Таму для журы, у якое ўвайшлі дзеячы культуры і мастацтва, навукоўцы, прафесійныя ідэолагі і журналісты, няпростым стала вызначэнне прызёраў у трох катэгорыях — «Найлепшы сцяг», «Найлепшы герб» і «Найлепшы сцяг і герб у адной творчай рабоце».

Пераможцамі ў катэгорыі «Найлепшы сцяг і герб» сталі Кацярына, Сцяпан і Пётр Хаменкі, а таксама Анатоль Палкоў, якія ўсе разам сабралі няпростую канструкцыю — мініяцюрную копію мінскай Плошчы Дзяржаўнага сцяга. «Чаму абралі гэту тэму? — перапытвае Кацярына. — Летась мы былі там падчас сустрэчы агню Еўрапейскіх гульняў — на плошчу трапілі ўпершыню, хоць самі і мінчане. І былі вельмі ўражаныя тым, як у адным месцы сканцэнтраваная беларуская дзяржаўнасць. Работа заняла з тыдзень, а вось ідэю выношвалі доўга — разлічвалі маштаб і прапорцыі, падбіралі матэрыял». Прызнаюцца: усе вельмі стараліся, таму на прызавое месца ў глыбіні душы разлічвалі, а вось першае стала прыемнай нечаканасцю.

Дзяўчаты побач з намі ціха перамаўляюцца: «Ох, на які прыгожы пастамент паставілі наш сцяг — як быццам мы перамаглі». Праз некалькі хвілін высвятляецца, што насамрэч так: калектыўны творчы праект навучэнцаў і педагогаў Мінскага фінансава-эканамічнага каледжа, выкананы з паперы ў тэхніцы скручвання, заняў І месца ў катэгорыі «Найлепшы сцяг».

— Мы далёка не творчая навучальная ўстанова: вось перад вамі будучы банкаўскі работнік і страхавы агент, — прадстаўляе сваіх вучаніц **кіраўнік Людміла РАСТАРГУЕВА.** — Але калі адна з нашых дзяўчат паказала свае работы з паперы, гэта вельмі натхніла і зацікавіла ўсіх астатніх. Ужо ў працэсе зразумелі, наколькі гэта гіганцкая і карпатлівая праца — 15 вечароў,



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

а часткова і начэй, дзяўчаты ў інтэрнаце рэзалі, скручвалі паперу, прыдумвалі, як найпрыгажэй. І выкладчыкі далучыліся: адна абшыла пенапластавую аснову палатном, другая ў апошні момант паправіла-падцягнула. Так што прозвішчы, якія ўказаны сярод аўтараў работы, — гэта толькі асноўны касцяк, насамрэч іх значна больш.

Дзяўчаты згадваюць: раздрукавалі піксельную выяву арнаменту, каб дакладна прытрымлівацца ўзору, але не разлічылі, што аснова папяровай кветкі супадае па памерах з трафарэтам, а ўверсе кветка пашыраецца, малюнак выходзіць зусім іншы — давялося перарабляць нанова. «Але нічога, — смяюцца, — мы любім пераадольваць цяжкасці, асабліва дзеля такога выніку!»

Аўтар «Найлепшага герба» — 16-гадовая Карына Вечар, якая зрабіла на льняной аснове рэльефнае дэкаратыўнае пано. А Гран-пры адкрытага творчага конкурсу «Сімвалы маёй краіны», здаецца, нечакана нават для сябе самога атрымаў Дзмітрый Кулінковіч — хлопчык прадставіў беларускія герб і сцяг у выглядзе імбірнага печыва, распісанага айсінгам (альбо, калі папросту, бялковай цукровай глазурай розных колераў). Канешне, дзевяцігадоваму канкурсанту дапамагала мама Кацярына — прафесійны кандытар, затое атрымаўся маленькі, цалкам натуральны духмяны шэдэўр і, магчыма, адзін з найлепшых варыянтаў сувеніра для замежнікаў. «Некаторыя хібы, безумоўна, у нашай рабоце ёсць, але стараліся працаваць без адходаў і перарабок, за двое сутак справіліся», — не без гонару зазначае Кацярына. І, пакуль Дзіма пазіруе фатографам, расказвае, што ў шэрагу захапленняў сына — не толькі печыва, але і квілінг, і валянне, а ў перспектыве і бісерапляценне. Дзіма ж смяецца, што печыва ў яго самы любімы ласунак, вось і давялося навучыцца яго гатаваць.

Акрамя трох прызавых месцаў у кожнай катэгорыі, журы прысудзіла таксама шэраг прызоў у спецыяльных намінацыях. Напрыклад, за ўдалае выкарыстанне сімволікі ў паўсядзённым жыцці адзначылі Юлію Бортнік, якая зрабіла ўнікальны офісны арганайзер — ён упрыгожаны стужкамі, што складаюцца ў выяву беларускага сцяга. Прыз «За канцэптуальнасць» атрымала 17-гадовая Дар'я Бацішчава — у яе роспісе па шкле перапляліся беларускія брэнды, сімвалы і знакавыя мясціны. Адзначылі і карпатлівую работу Ганны Сакалоўскай у тэхніцы алмазнай мазаікі, і тэхнічнасць пластылінавай аплікацыі Івана Джуса, Яраслава Саўко і Савелія Ладуцькі, і творчыя знаходкі многіх іншых юных і дарослых канкурсантаў. Усе яны атрымалі дыпломы і памятныя падарункі. Убачыць работы лаўрэатаў можна, наведаўшы часовую выстаўку ў Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці. А натхніўшыся, можна ўзяць удзел у наступным творчым конкурсе — як запэўніваюць у Нацыянальным гістарычным музеі, яны абавязкова будуць працягвацца.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

На доўгую памяць

# ВЕДАЦЬ ПРА ВАЙНУ, КАБ ЖЫЦЬ У МІРЫ

**Трэцяя, завяршальная частка маштабнага культурна-гістарычнага праекта «Вайна і мір», прымеркаванага да 75-годдзя Вялікай Перамогі, адкрылася 1 ліпеня ў Нацыянальнай бібліятэцы. На выстаўцы «Вайна і мір. Беларусь памятае. Вяртанне» прадстаўлены ўнікальныя дакументы, кнігі і перыядычныя выданні, старадрукі і рукапісы, паштоўкі і літаграфіі, якія адлюстроўваюць гісторыю ваенных дзеянняў з 1812 да 1945 года, а таксама перыяды мірнага міжваеннага жыцця на беларускай зямлі.**

Нагадаем, ініцыяваны Міністэрствам інфармацыі Беларусі і лаўрэатам прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», краязнаўцам і калекцыянерам Уладзімірам Ліхадзедавым, падтрыманы Міністэрствам культуры асветніцкі праект «Вайна і мір» бярэ пачатак яшчэ ў лютым. Сутнасць яго ў тым, каб праз цыкл выставак данесці да максімальна шырокай аўдыторыі вытокі і традыцыі патрыятызму беларускага народу, паказаць, як праз пакаленні перадаваліся любоў да Радзімы і гатоўнасць абараняць яе нават цаной уласнага жыцця. Папярэднія экспазіцыі адбыліся ў Дзяржаўным мемарыяльным музеі Якуба Коласа і Нацыянальным гістарычным музеі, далей планавалася ахапіць яшчэ тры гістарычныя перыяды вайнаў і міжваеннага часу, задзейнічаць некалькі пляцовак у бібліятэках, музеях, буйных навучальных установах, а кульмінацыяй праекта напярэдадні Дня Перамогі мусілі стаць зборная вялікая выстаўка і форум калекцыянераў з розных краін свету ў Нацыянальнай бібліятэцы.

На жаль, праз напружаную эпідэміялагічную сітуацыю ў Беларусі і ў свеце арганізатарам давялося істотна скарэкціраваць гэтыя планы — але не адмяніць іх.

Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Віктар Лісковіч падкрэсліў: глыбока сімвалічна, што выстаўка адкрылася напярэдадні свята Дня Незалежнасці: «Тут прадстаўлены падзеі і людзі, якія стаялі каля вытокаў і сённяшняй незалежнасці, і, на мой погляд, нашай будучыні. Гэтыя людзі з году ў год памнажалі наш дабрабыт і рабілі нашу краіну лепшай, бо ўсіх іх аб'ядноўвала любоў да Радзімы».

Цэнтральная частка выстаўкі «Вайна і мір. Беларусь памятае. Вяртанне» — каля 30 кніг Уладзіміра Ліхадзедава, у тым ліку выданні, якія ўбачылі свет у серыі «У пошуках страчанага», і зусім свежыя навінкі: двухтомнік «75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне» і «Блакада» (Выдавецкі дом «Звязда»), «Беларусь шматнацыянальная» (выдавецтва



«Альфа кніга»). «Кожная з гэтых кніг па-свойму важная для мяне і, спадзяюся, для чытачоў, — прадставіў новыя выданні Уладзімір Аляксеевіч. — Асноўная задумка «75 гадоў Перамогі» — падарожжа ў часе, параўнанне відаў беларускіх мястэчак: якімі яны былі ў даваенны час, якія страшныя сляды разбурэння пакінула на іх Вялікая Айчынная вайна, якімі яны сталі ў цяперашні час; таксама ў кнізе прадстаўлены выпускі сатырычнага агітплаката «Раздавім фашысцкую гадзіну!», рэдактарам якога быў Кандрат Крапіва. Кніга «Блакада» — на першы погляд, пры чым тут Беларусь? Але насамрэч у Ленінградзе жыло і абаранялa яго мноства беларусаў, у тым ліку і мая прабабуля, якая загінула падчас блакады. І гэтае выданне, ідэю якога я даўно выношваў, — даніна памяці ёй, усім загінулым і ўсім тым, дзякуючы каму нават у жорсткай асадзе горад жыў, працавалі заводы, школы, пошта... З лістоў, з надпісаў на паштоўках, якія пакінулі ленінградцы, мы можам адчуць трагічную атмасферу той эпохі і моц духу савецкага народа... «Беларусь шматнацыянальная» планавалася як падарунак гродзенцам і гасцям рэспубліканскага свята нацыянальных культур, аднак, паколькі фэст перанеслі на наступны год, мы вырашылі не чакаць і выдаць яе цяпер. Было даволі складана знайсці паштоўкі канца XIX—пачатку XX стагоддзя, што паказвалі б, прадстаўнікі якіх нацыянальнасцяў жылі на тэрыторыі Беларусі, якімі былі іх будні і святы, і, тым не менш, мы пастараліся прадставіць усё багацце і разнастайнасць розных канфесій і нацыянальных культур беларусаў, рускіх, палякаў, яўрэяў, латышоў, літоўцаў, немцаў, французаў, татар, туркаў, нават кітайцаў і манголаў. Многія фотаздымкі публікуюцца ўпершыню і, мяркую, будуць карысныя і цікавыя даследчыкам гісторыі».

Іншыя экспанаты — прадметы і дакументы з прыватнай калекцыі, якую Уладзімір Аляксеевіч рупліва збірае ўжо некалькі дзясяткаў гадоў, прычым рэгулярна перадае частку рарытэтаў у падарунак вядучым музеям і бібліятэкам.

Намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі вызначыў ключавыя словы, якімі можна ахарактарызаваць увесь праект: Перамога як сімвал канчатковай, незваротнай кропкі ў гісторыі кравапраліцця на беларускай зямлі, незалежнасць, якую здабылі, адстаялі і перадалі нам як вялізную каштоўнасць папярэднія пакаленні, і спадзвіжніцтва — справа, якая робіцца апантанымі, самааддaнымі людзьмі не дзеля славы і матэрыяльных выгод, але ў рэшце рэшт становіцца важнай часткай захавання гістарычнай памяці.

Апошнюю думку падхапіў і генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі: «Хачу адзначыць вялікі ўнёсак калекцыянераў, дзякуючы якім па драбніцах вяртаюцца ў нашу краіну тыя выданні і дакументы, якія некалі былі вывезеныя — у ваенных абозах, разам з іншым нарабаваным скарбам, у багажы бежанцаў і вымушаных перасяленцаў — як мы часам кажам, боты загарнулі ў газету, і толькі дзякуючы гэтаму яе адзіны на сёння асобнік захаваўся ў музеі пэўнай краіны... Адзін з такіх людзей, якія дапамагаюць вярнуць на радзіму гістарычныя артэфакты, — Уладзімір Ліхадзедаў, які сабраў насамрэч фантастычную калекцыю матэрыялаў па Беларусі. Я ўпэўнены, што гэтая работа будзе працягвацца, бо незалежнасць любой краіны — гэта не дзяржаўная граніца і не армія, і нават не ўласныя грошы. Незалежнасць — гэта дух, які жыве ў народзе, і я спадзяюся, што разам мы сфарміруем гэты моцны дух...»

Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Ігар Марзалюк нагадаў, дарэчы, што дзякуючы самаахвярнасці беларускіх бібліятэкараў і музейшчыкаў у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны былі ўратаваны многія гісторыка-культурныя каштоўнасці нашай краіны. Так, беларускія кнігі эвакуіравалі ў Маскву, Санкт-Пецярбург, Навасібірск — здавалася, часова, але фактычна многія з іх дагэтуль не вярнуліся. «Я ўжо неаднаразова выказваў думку, і зноў паўтаруся, што ў юбілейны год Перамогі трэба вяртаць у Беларусь тыя каштоўнасці, артэфакты, якія ёй належаць», — зазначыў Ігар Марзалюк.

Як плануецца, экспазіцыя «Вайна і мір. Беларусь памятае. Вяртанне» будзе працаваць у выставачным комплексе Нацыянальнай бібліятэкі да канца бягучага года.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота аўтара.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Тыдзень спрыяльны для адпачынку на прыродзе і асабістага жыцця. Зрэшты, пра работу таксама забываць не варта, важна не спазняцца. Аднак не трэба спрабаваць заваяваць рэпутацыю працаголіка: вашы намаганні не ацэняць. Арыгінальнасць, спрыт і дыпламатычнасць дазволяць справіцца з многімі праблемамі. У чацвер будуць удала складвацца справы, якія патрабуюць творчага падыходу. У суботу прыміце да ўвагі планы навакольных.

**ЦЯЛЕЦ.** Непажадана брацца за новыя праекты або даваць згоду на ўдзел у нейкіх авантурах. Будзьце больш асцярожныя: ёсць небяспека ў пэўных сітуацыях пераацаніць свае сілы. Паспрабуйце не ўцякаць ад адказнасці ў рабочых пытаннях. Вам ніхто не прапаноўвае вырашаць іх у адзіночку, ад вас патрабуецца толькі адно: не звальваць на іншых тое, што будзе ўскладзена на вас. Бліжэй да сярэдзіны тыдня магчымыя пераацэнка каштоўнасцяў і расчараванне ў любімым чалавеку.

**БЛІЗНЯТЫ.** У вас велізарная колькасць цікавых ідэй і новых планаў, але неабходна засяродзіцца на найбольш перспектыўных, тады атрымаецца ўвасобіць іх у жыццё. У вас з'явіцца новая крыніца даходу. Ёсць імавернасць, што давядзецца заняцца жыллёвым пытаннем. Не забывайце пра асабістае жыццё, у гэтай сферы будуць грандыёзныя перамены, прычым да лепшага.

**РАК.** Вам неабходна звярнуць на работу пільную ўвагу, ёсць шанц умацаваць свой аўтарытэт. Шмат часу давядзецца прысвяціць вырашэнню сямейных праблем, у вас будзе актыўнае асабістае жыццё. У панядзелак пажадана не планаваць нічога сур'ёзнага. Пятніца і выхадныя — добрыя дні, калі магчымыя сустрэчы з прыемнымі людзьмі, забавы і паходы ў госці.

**ЛЕЎ.** Кар'ерныя магчымасці, якія адкрываюцца перад вамі, радуюць, але не варта дэманстраваць перавагу перад калегамі. У панядзелак плённа пройдуць дзелавыя сустрэчы і перамовы. У сераду вы будзеце занадта запальчывыя. У выхадныя не адмаўляйцеся ад прапановы пайсці ў госці: сустрэча з новымі, цікавымі людзьмі дапаможа расслабіцца і дазволіць павесяліцца ад душы, а гэта вам неабходна.

**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні можа завяршыцца важны этап у вашай кар'еры, не варта спяшацца з прыняццем рашэнняў. Старанна ўзважце ўсе шанцы. Не рэкамендуецца рэзка рэагаваць на негатыўныя выказванні ў ваш адрас, нават на зусім недарэчныя. Дапамогі і падтрымкі на гэтым тыдні чакаць не варта, разлічвайце толькі на сябе. У чацвер магчымыя рэзкія перапады настрою. У суботу могуць паўстаць праблемы ў асабістым жыцці, можаце даведацца пра здраду.

**ШАЛІ.** Вы не проста павінны, вы будзеце вымушаныя даводзіць да завяршэння практычна ўсе пачатыя справы. У аўторак прыток сіл дазволіць літаральна зрынуць горы, могуць увасобіцца ў жыццё нават самыя нязбытныя мары. Галоўнае — не сумнявайцеся, бо ўсё залежыць ад вас. Выхадныя дні лепш правесці за горадам, на дачы, у месцах, далёкіх ад мітусні.

**СКАРПІЁН.** Па магчымасці звядзіце аб'ём работы да разумнага мінімуму і больш адпачывайце — вы і так атрымаеце салідны прыбытак. У сераду важная справа запатрабуе ад вас рэдкай засяроджанасці і хуткасці дзеянняў. Аднак потым добра было б расслабіцца і заняцца асабістым жыццём. Гэта абяцае нямала задавальненняў.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні на вашы плечы ляжа місія міратворца — на рабоце, сярод блізкіх людзей і сяброў. У панядзелак прыслухайцеся да голасу інтуіцыі — магчыма, менавіта яна падкажа, як дзейнічаць далей і якую мэту паставіць. У сераду не варта спяшацца з новаўвядзеннямі: яны, вядома, карысныя, але пакуль нясвоечасовыя. У пятніцу пастарайцеся хоць імітаваць бурную дзейнасць, бо вы апынецеся ў полі зроку начальства. Суботу правядзіце на пляжы.

**КАЗЯРОГ.** Спрыяльная ўсякая працоўная дзейнасць, а вось у адпачынак адпраўляцца не варта. Гэты тыдзень пройдзе ў клопатах па падрыхтоўцы да нечага важнага. Упарадкуйце свае дзеянні, выдаткаваўшы пэўны час на планаванне, і вам удасца справіцца з усім без мітусні і спазнення. Работа будзе плённая, што выдатна адаб'ецца на настроі і ўмацуе ваш аўтарытэт. У занятках і адносінах, якія вы не хацелі б выстаўляць на ўсеагульны агляд, неабходна праявіць няспешнасць і разважлівасць.

**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні вы будзеце прыцягваць навакольных дабрынёй, мудрасцю і шчырым жаданнем прыйсці на дапамогу ў цяжкую хвіліну. Аднак не дазваляйце садзіцца сабе на шыю. Чацвер — самы спрыяльны дзень для прызнання ў каханні. Пятніца — удалы дзень для актыўных дзеянняў, ваша працаздольнасць сябе апраўдае. У суботу лепш не лезці ў дыскусію блізкіх людзей, якая перарасце ў спрэчку, бо ўсё роўна ваш голас не стане вырашальным.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні вам, хутчэй за ўсё, давядзецца цэлымі днямі разграбаць назапашаныя праблемы. Галоўнае — не запускаць бягучыя справы, інакш да канца тыдня груз стане непасільны. Пачатак тыдня можа збянтэжыць усе планы і задумы, але ўжо да серады сітуацыя стане больш зразумелай. У чацвер магчымыя падман і хлусня. Не верце малазнаёмым людзям, ды і даўнія прыяцелі могуць аказацца ненадзейнымі: давярай, але правярай.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.45 | 21.43 | 16.58 |
| Віцебск — | 4.26 | 21.41 | 17.15 |
| Магілёў — | 4.35 | 21.33 | 16.58 |
| Гомель — | 4.41 | 21.20 | 16.39 |
| Гродна — | 5.02 | 21.56 | 16.54 |
| Брэст — | 5.12 | 21.48 | 16.36 |

### Месяц

*Першая квадра 28 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

### Імяніны

***Пр.*** *Георгія, Максіма, Паўла, Юльяна.*
***К.*** *Альжбеты, Мальвіны, Андрэя, Інакенція, Тодара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 4 ЛІПЕНЯ

У краіне

**1903** год — нарадзілася Вольга Міхайлаўна Барысевіч, беларускі рэжысёр оперы. У 1926—1931 гадах — артыстка БДТ-2. З 1931-га — рэжысёр-асістэнт Беларускай студыі оперы і балета, у 1933—1947 гадах — рэжысёр Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Удзельнічала ў стварэнні нацыянальнага рэпертуару.

**1920** год — у ходзе савецка-польскай вайны пачалася ліпеньская аперацыя войскаў Заходняга фронту, у выніку якой да 1 жніўня ад польскіх войскаў была вызвалена амаль уся тэрыторыя Беларусі.

**1940** год — указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР устаноўлены ганаровыя званні «Заслужаны ўрач Беларускай ССР», «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР», «Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР» (з 13 красавіка 1995-га адпаведна «Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь», «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь», «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь»).



**1954** год — у Мінску на плошчы Перамогі адкрыты манумент Перамогі — помнік у гонар воінаў Савецкай Арміі і беларускіх партызан, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Ён стаў сімвалам сталіцы Беларусі. 3 ліпеня 1961 года каля падножжа манумента запалены Вечны агонь.

У свеце

**1790** год — нарадзіўся Джордж Эверэст, брытанскі геадэзіст. Выканаў тапаграфічную здымку тэрыторыі Індыі і першы вызначыў вышыню найвялікшай вяршыні свету — Эверэста, якая і была названая ў яго гонар.

**1815** год — нарадзіўся Павел Андрэевіч Фядотаў, рускі жывапісец і графік, родапачынальнік крытычнага рэалізму ў рускім выяўленчым мастацтве. Аўтар карцін «Разборлівая нявеста», «Сватаўство маёра», «Свежы кавалер».

**1910** год — нарадзілася Глорыя Сцюарт, амерыканская актрыса. За сваю акцёрскую кар'еру, якая доўжылася больш за 70 гадоў, Сцюарт паспела папрацаваць у тэатры, у кіно, а таксама на тэлебачанні.

**1930** год — нарадзіўся Фрунзік Мушэгавіч Мкртчан, армянскі акцёр, народны артыст СССР. Здымаўся ў фільмах «Айбаліт-66», «Каўказская палонніца, ці Новыя прыгоды Шурыка», «Мімiно». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

Так гаварыў...

**ШЭКСПІР:**
*«Я бачу, што мода зношвае больш адзення, чым чалавек».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Як ты пазнаёміўся са сваёй жонкай?
— А, выпадкова... Вінаваціць няма каго...

**— Марына, раскажыце пра сябе ў двух словах?**
**— Усякае бывала...**

Адна бландзінка другой:
— Я зрабіла сабе другую дзірку ў вуху!

— Ну і як, цяпер лепш чуваць?

**Трэці дзень сяджу на дыеце... Ой, дзяўчаты... не маё гэта, не маё...**

Манікюр... Педыкюр... Макіяж... Эпіляцыя...
Эээх, а ў дзяцінстве завяжы стужачку — і прыгажуня!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2231.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 ліпеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12